**Т. Супрунчык, Л. Чэчат**

# ГІСТОРЫЯ ШЛЯХЕЦКАГА РОДУ ЛЯШКЕВІЧАЎ-ЗЯНОВІЧАЎ-АЛЬПЕНСКІХ ВА ЎСПАМІНАХ ЛЮДЗЕЙ СТАЛАГА ВЕКУ, АРХІЎНЫХ ДАКУМЕНТАХ І ФОТАЗДЫМКАХ

Мэтай работы з'яўляецца захаванне памяці аб сваіх продках шляхам стварэння радаводу Ляшкевічаў-Зяновічаў-Альпенскіх і асабістага сямейнага архіва. Для дасягнення гэтай мэты былі сфарміраваны і паслядоўна разгледжаны наступныя задачы: адшукаць дакументальныя гістарычныя звесткі аб узнікненні шляхецкага роду Ляшкевічаў; сабраць даныя аб носьбітах прозвішча Ляшкевіч у межах радзінных сувязяў; стварыць радаводнае дрэва Ляшкевічаў і дэталёва сістэматызаваць звесткі аб членах сям'і ў генеалагічным ланцужку; стварыць архіў сямейных фотаздымкаў.

Нешматлікія дакументы, якія захаваліся, дапамаглі ўзнавіць гісторыю шляхецкага роду Ляшкевічаў-Зяновічаў Альпенскіх, пачынаючы з 1515 года.

Запісы Седляра Іллі Іванавіча, 1914 г. н., які цікавіўся гісторыяй сваёй вёскі з малых гадоў і запісваў на працягу жыцця ўспаміны людзей сталага веку, апісваў падзеі, складаў радаводы мачульскіх радоў, расказваюць пра пачынальніка радаводу мачульскіх Ляшкевічаў, продкаў аўтара па маці, бабулі, прадзеду. Цікава тое, што жанчыны з роду Ляшкевічаў апошніх пяці пакаленняў не змянялі прозвішчы пры замужжы. Таму і ў радавод яны таксама ўключаны як носьбіты прозвішча.

Род Ляшкевічаў-Зяновічаў-Альпенскіх меў свой герб. Яго першая выява датавана 1293 годам, а дакументальны запіс – 1398 годам. Увогуле «Наланч» меў некалькі выяў у розных шляхецкіх родаў, але яго дакладнае апісанне ў Ляшкевічаў-Зяновічаў-Альпенскіх знаходзім у архіўных дакументах.

За час працы былі вывучаны, прааналізаваны і запісаны дакументальна-гістарычныя звесткі аб узнікненні шляхецкага роду Ляшкевічаў, успаміны членаў сям'і аўтара, а таксама ўспаміны іншых сем'яў роду Ляшкевічаў, было створана генеалагічнае дрэва, знойдзена выява герба, створаны фотаархіў.

Стварэнне радаводу сваёй сям'і ці вядомых людзей Беларусі можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай літаратуры ці гісторыі як сродак выхавання нацыянальнай свядомасці навучэнцаў.